# Новы імпульс да развіцця

**Першае ў Віцебскай вобласці аддзяленне кафедры ЮНЕСКА ўрачыста адкрылася 5 мая ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.**

Адпаведны дагавор падпісалі намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь Віктар Шаршун і рэктар ПДУ Алег Раманаў. Да знакавай падзеі ў жыцці ўніверсітэта быў прымеркаваны рэспубліканскі круглы стол "Інфармацыйныя тэхналогіі ў юрыдычнай адукацыі і дзяржаўным кіраванні" на юрыдычным факультэце, арганізаваны ПДУ, НЦПІ і Рэгіянальным цэнтрам прававой інфармацыі Віцебскай вобласці.

— Інфарматызацыя і лічбавізацыя ў сучасным грамадстве пранізвае ўсе сферы жыцця, уключаючы адукацыю, — адзначыла загадчык кафедры канстытуцыйнага права і дзяржаўнага кіравання ПДУ Ірына Шахноўская. — На працягу доўгага часу мы актыўна ўзаемадзейнічаем з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі. Адкрыццё аддзялення кафедры ЮНЕСКА надасць нашаму супрацоўніцтву новы імпульс да развіцця, будзе садзейнічаць больш эфектыўнай арганізацыі адукацыйнага працэсу і павышэнню якасці прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў нашага факультэта. У прыватнасці, чакаецца, што ў іх з'явіцца магчымасць на льготных умовах карыстацца інфармацыйна-прававой сістэмай ЭТАЛОН-ONLINE. Акрамя таго, новае аддзяленне кафедры стане пляцоўкай пашырэння міжуніверсітэцкага і міжнароднага супрацоўніцтва, правядзення навуковых форумаў, метадычных мерапрыемстваў, вэбінараў і практычных заняткаў, у тым ліку з запрашэннем экспертаў ЮНЕСКА. Праграма супрацоўніцтва таксама прадугледжвае стажыроўкі нашых выкладчыкаў і арганізацыю практык студэнтаў у НЦПІ.

**Таццяна БОНДАРАВА.**
*vitsebsk@ng-press.by*